сю праз гады на чужыне і адкрывае свой глыбінны сэнс: гэта метафара беларускага нацыянальнага характару з яго цярплівасцю, цягавітасцю, глыбокім духоуным патэнцыялам. Такім чынам, у "Птушках і гнёздах" узнікае асацыятыуны рад: маці — Радзіма — народ – нацыянальная ідэя. Усе гэтыя каштоунасці кожнаму дадзены ад роду, але каб стаць асобай, трэба іх усвядоміць, выпакутаваць, нібыта нанова адкрыць для сябе. Пошукам Радзімы, якія чакаюць Алеся Руневіча, нездарма папярэднічала унутраная раздвоенасць паміж роднай маці і "другой мамай". Пані Ванда — чалавек з іншага асяроддзя, яно прываблівае культурай, прыгажосцю, нязнанымі пачуццямі. Міжволі паустае спакуслівае пытанне: "чаму мая маці не такая, як яна?" У разлуцы, у выпрабаваннях вайной і палонам разам з сапраўднай сталасцю асобы да Алеся прыйдзе адзіна верны адказ: "Але ж яна у мяне, як і ва усіх, — адна!..". "Я прыйду, дарагая, я усё ж такі калі-небудзь прыйду!.. І усё зраблю тады, каб ты адпачыла ад слёз, ад пакутау сваіх, ад беспрасветнай працы для нас, для зямлі... Ты адпачнеш, будзеш сядзець пад хатай, дзе сонца асвеціць рабіну, яе хвалююча-аранжавыя, маладыя гронкі, дзе на градах, яшчэ усё табою аполатых, будзе пахнуць кроп, а старая карова, вярнуушыся з пашы, толькі цябе будзе клікаць з даёнкай". Самавызначэнне Руневіча-сына абумоулівае і вынікі яго пошукау Радзімы. Але ж чалавеку, паводле вядомага чэхаускага выразу, патрэбны увесь зямны шар. Жаданне быць чалавекам, а не прымусовыя абставіны вядуць героя рамана ад роднага гнязда у вялікі свет, і "компасам" у блуканнях для яго зноу жа становіцца маці — успаміны пра сваю, родную і далёкую, выпадковая сустрэча з пажылой немкай. "Увесь свет — адзін дом", — скажа яна, дапамагаючы уцекачам з палону. У гэта хочацца верыць і уяуляць на чале агульначалавечага дому саму Мадонну, вобраз якое увайшоу у свядомасць Алеся праз высокае мастацтва (Шуберт, Рафаэль). Аднак гэта — ідэал. У сапраўднасці зямны шар — "жывы глобус, мокры ад крыві і шурпаты ад руін" — "вусцішна круціцца у чорнай бездані". Яму, здаецца, няма справы да дзяучынкі, што бяжыць босая па снезе з падпаленай карнікамі вёскі. Але людзі уратуюць, не пакінуць. "У родным цяпле яна, як парастак, адышла, дажыла да першай усмешкі, расцвіла пасля пладаноснай красой, здабыла святое права называцца словам маці". Гэта жыццё: не суцэльная гармонія, але імкненне да яе, пераадоленне цемры і смерці.

**Ірына Чыкалава**
*Беларускі дзяржауны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка*

## ЖАНЧЫНА: СУБ'ЕКТ ЦІ АБ'ЕКТ ПАЛІТЫКІ?

У аснове разважанняу марксісцкіх тэарэтыкау наконт дыскрымінацыі жанчын было перакананне, што сацыяльная рэвалюцыя заадно вырашыць і іх праблемы і што жаночая эмансіпацыя магчыма толькі пры сацыялізме. Паколькі афіцыйная у савецкай дзяржаве марксісцкая ідэалогія не прызнавала, што у жанчын

ёсць спецыфічныя інтарэсы, якія адрозніваюцца ад агульнакласавых, праз усю гісторыю савецкага грамадства праходзіць адмауленне самастойнага статуса жаночых праблем. Гэта прывяло да таго, што у савецкай дзяржаве жаночы вызваленчы рух быу падначалены пралетарскаму. Мужчынская частка грамадства прысвоіла сабе права выказваць інтарэсы жанчын, падпарадкавала жаночы рух глабальным сацыяльным задачам у мужчынскім разуменні — ці то гэта была рэвалюцыя, ці ажыццяуленне індустрыялізацыі і калектывізацыі, нарошчванне абароннай магутнасці краіны, барацьба з "ворагамі народа", арганізацыя "вялікіх будоуляу камунізму" і г.д. Сёння ужо відавочна, што практыка вырашэння жаночага пытання у СССР з'явілася адной з самых вытанчаных гістарычных містыфікацый. Само ж савецкае грамадства, у якім інтарэсы жанчын былі падначалены класавым задачам, стала яскравым прыкладам маскуліністцкай культуры.

Сапрауды шматабяцаючымі выглядалі першыя дакументы савецкай улады, якія афіцыйна абвясцілі роуныя правы жанчын з мужчынамі, уключаючы роуныя выбарчыя і роуныя сацыяльна-эканамічныя правы (8-гадзінны рабочы дзень незалежна ад полу, роуная аплата працы). У адным шэрагу з імі быу апублікаваны у 1918 годзе першы кодэкс аб шлюбе і сям'і, які прадугледжвау свецкі характар шлюбу; роуны з мужчынамі статус жанчыны у шлюбе; магчымасць для жанатых пар выбіраць прозвішча мужа ці жонкі; надзяленне дзяцей, народжаных па-за шлюбам, аднолькавымі правамі з народжанымі у шлюбе. Гарадскія жанчыны аслабаняліся ад працы на 8 тыдняу да і 8 тыдняу пасля родау з захаваннем поунага заробку дэкрэтам 1917 года "Аб страхаванні на выпадак хваробы". Варта заувважыць, што больш за 85 працэнтау насельніцтва Беларусі у гэты час жыло у сельскай мясцовасці.

Беларусь была характэрным прыкладам краіны, у якой, як ва усім СССР, хоць і аб'яулялася аб поунай юрыдычнай роунасці жанчын з мужчынамі у грамадскім і сямейным жыцці, роунасць гэтая існавала толькі у тэорыі. Пастаноука "жаночых пытанняу", іх змест у гады савецкай улады вызначаліся перш за усё зыходзячы з задач пэунага моманту сацыялістычнага будауніцтва, а не са спецыфічных інтарэсау саміх жанчын, сама думка аб магчымай наяунасці якіх нават не ставілася на абмеркаванне. Жаночы рух усе гады савецкай улады знаходзіуся пад жорсткім партыйным кантролем, які існавау і у адкрытай, і у завуаліраванай формах. Напрыклад, сетка *жаночых аддзелау*, якая пачала стварацца з 1918 года, функцыянавала з адабрэння партыі і пад яе наглядам. Але і іх функцыі Сталін абвясціу у 1929 годзе выкананымі і зліквідавау як непатрэбныя.

Гады сталінскіх рэпрэсіи сталі драматычнымі для лёсу беларускай інтэлігенцыі, галоуным абвінавачаннем супраць якой станавілася сапраудная ці уяуная прыналежнасць да сацыял-дэмакратызму. У гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XX стагоддзя цяжка знайсці больш яркую жаночую асо-

бу, чым Палута Бадунова, якая прайшла турмы польскай дэфензівы і камеры Бутырскай турмы. Яе імя трапляецца у спісах амаль усіх нацыянальна-палітычных арганізацый з 1917 года. Галоунай марай яе жыцця было убачыць Беларусь суверэннай і незалежнай. Уваходзіла яна і у склад урада Беларускай Народнай Рэспублікі. Па прычыне цяжкай хваробы ужо у сярэдзіне 1920-х гадоу Бадунова адышла ад палітычнай дзейнасці, была зламана фізічна, жыла на утрыманні сястры, таму што была не у стане працаваць. Але нягледзячы на гэта у 1937 годзе яна была арыштавана і з засценкау НКВД ужо не выйшла: у 1938 годзе яе расстралялі.

Адных, як Палуту Бадунову, знішчалі фізічна, другіх, як паэтэсу Ларысу Геніюш, якая пакінула кнігу сваіх успамінау "Споведзь", адпраулялі у спецыяльныя **жаночыя** лагеры Гулага. На аднаго дзеяча літаратуры, які заставауся на волі, чацвёра былі у турмах і лагерах. Там жа апынуліся і многія жонкі дзеячау навукі і культуры, арыштаваныя услед за мужамі на "правах" жонак "ворагау народа". Лагерны тэрмін давау хоць невялікія шансы выжыць. Вярнулася з лагера у 1956 годзе Дзіна Харык, жонка расстралянага паэта Ізі Харыка, але яна так і не змагла нічога даведацца пра лёс сваіх пакінутых у Мінску дзяцей. Не кожная жанчына вытрымлівала цяжкую працу і невыносныя умовы жыцця у лагеры. Загінула у лагеры строгага рэжыму жонка галоунага рэжысёра яурэйскага тэатра Мойшы Рафальскага. Аб агульнай жа колькасці жанчын, рэпрэсаваных у гады тэрору, сведчаць звесткі аб рэабілітаваных грамадзянах Беларусі: з рэабілітаваных у 1955—1996 гадах жыхароу Мінска і Мінскай вобласці прыкладна 11 працэнтау складалі жанчыны.

Новым этапам у дзяржаунай палітыцы, з якім былі звязаны трансфармацыі у статусе жанчын і у самім жаночым руху, сталі 1930-я гады. Жанчыны былі абвешчаны магутнай сілай у прамысловасці, сельскай гаспадарцы і апорай сям'і. Дэбаты па "жаночым пытанні", якія актыуна вяліся у 1920-я гады дзякуючы дзейнасці жаночых аддзелау, былі забаронены. Больш таго, сталінскі урад перагледзеу ранейшую палітыку, што тычылася жанчын і сямейнага жыцця. Так, у сярэдзіне 30-х гадоу аборты, дазволеныя яшчэ у 1920 годзе, былі забаронены, атрымаць развод стала нашмат цяжэй і даражэй. Сям'я атрымала афіцыйную назву сацыялістычнай. Эмансіпацыя жанчын абвяшчалася дасягнутай і жаночае пытанне вырашаным.

Аднак рэальнасць была іншай. Жанчыны не сталі самастойным суб'ектам палітыкі. Іх энергія і энтузіязм спатрэбіліся для забеспячэння жыццяздольнасці новага ладу. Роунасць жанчын з мужчынамі зводзілася уладаю да іх масавага прыцягнення нарауне з мужчынамі да вытворчасці. Пры гэтым паказчык колькасці жанчын у складзе рабочых і служачых у Беларусі — 40 працэнтау — у 1940 годзе быу нават вышэйшы, чым у сярэднім па СССР. Мэтай урада было максімальна павялічыць колькасць рабочага класа, які разглядауся як яго галоуная апора. Рэсурсы

папауненння рабочага класа мужчынамі былі вычарпаны. Сотні тысяч мужчын знаходзіліся у кадравай арміі, міліцыі, у велізарным апараце камітэта дзяржаунай бяспекі. А новыя будоулі патрабавалі новых рук. Так прыйшла чарга жанчын; дзесяткі тысяч дзяучат прыехалі на прамысловыя будоулі з вёсак. Прычым на іх плечы клалася самая цяжкая праца. Жанчына "асвоіла" спецыяльнасці будауніка, токара, фрэзероушчыка, нават машыніста і памочніка машыніста лакаматыва. Яна прыйшла у ліцейную вытворчасць, паліграфічную прамысловасць.

Нягледзячы на тое, што савецкая улада дэкларавала роуную аплату мужчынскай і жаночай працы, нават афіцыйная даваенная статыстыка сведчыць, што у жанчын яна была ніжэйшая. У гісторыі зафіксаваны спробы жанчын пратэставаць супраць цяжкіх умоу жыцця і побыту. Аднак хутка выступленні жанчын у абарону сваіх правоу спыніліся: пачыналася эпоха рэпрэсіи. Сёння нават з тых, каму было толькі 20 гадоу у далёкія 30-я, нямногія засталіся жывымі. Няма у каго ужо спытаць, ці былі яны шчаслівыя на схіле сваіх гадоу.

Сельская жанчына — гэта асобная тэма. Працуючы у калгасе практычна бясплатна, пазбауленая элементарных грамадзянскіх правоу (толькі у 1960-я гады калгаснікам пачалі выдаваць пашпарты), яна стала прыгоннай у дзяржавы, аутарытэт якой для яе увасабляу мужчына — старшыня калгаса. Ад таго, "добры" ці "дрэнны" старшыня, залежала вырашэнне мноства асабістых праблем, з якімі жанчына прыніжана ішла да кірауніка.

Праца у калгасе не была нармаваная. Большасць калгасніц не мелі водпуску, не атрымлівалі дапамогі пры хваробе. У большасці гаспадарак цяжарныя і хворыя жанчыны выходзілі на цяжкую працу нават з высокай тэмпературай. Праца у калгасе фактычна не аплочвалася. Асноунай крыніцай даходау калгасных сем'яу былі прысядзібныя участкі. Але яны таксама поунасцю трымаліся на жаночых руках.

Усё менш заставалася у вёсцы мужчын. У выніку сталінскіх рэпрэсій у СССР загінулі мільёны людзей. У Беларусі ахвярамі рэпрэсій стала больш за 600 тысяч чалавек. Амаль 68 працэнтау рэпрэсаваных былі з сялян. Адпрауляліся на расстрэл многія заможныя сяляне, а тыя, каму "пашанцавала", разам з сем'ямі ішлі па этапу у аддаленыя раёны краіны, пакідалі вынішчаныя гаспадаркі, паколькі раскулачванне азначала поуную канфіскацыю маёмасці. У раскулачаных гаспадарках заставаліся жонкі, маці і дзеці — яны цяпер павінны былі карміць краіну. А у многіх ужо не хапала сіл пракарміць саміх сябе: падаткавая сістэма вымятала усё, што атрымлівалі у калгасах і саугасах і нават на прысядзібных участках. На працягу 1930-х гадоу сельскае насельніцтва рэспублікі пастаянна знаходзілася перад пагрозай голаду.

Савецкая жанчына выхоувалася у атмасферы двайных стандартау і двайной маралі. З дзяцінства ёй гаварылі аб яе эмансіпаванасці і аб яе роунасці з мужчынамі. Дзяучынкі сапрауды мелі роуны з хлопчыкамі доступ да сярэдняй адукацыі і, звычайна

праяуляючы болей стараннасці, нават выходзілі са школ з лепшымі паказчыкамі. Пра гэта сведчыць хаця б той факт, што, напрыклад, у 1985 годзе у вышэйшых навучальных установах рэспублікі у агульнай колькасці студэнтау было 58 працэнтау дзяучат, а у складзе навучэнцау сярэдніх спецыяльных навучальных устаноу — 62 працэнты. У цэлым тэмпы росту адукацыйнага узроуню жанчын былі значна вышэйшыя, чым у мужчын. Савецкай прапагандай гэта ставілася у заслугу сацыялізму. Аднак цяжкім і зусім немагчымым для дзяучат было паступіць вучыцца у ВНУ па некаторых найбольш прэстыжных спецыяльнасцях. Дыскрымінацыя жанчын працягвалася на этапе размеркавання на працу пасля заканчэння ВНУ: перавагу традыцыйна мелі мужчыны.

Як правіла, жанчынам заставаліся пасады, якія не задавальнялі мужчын, і яны займалі вызваленыя імі рабочыя месцы. Большая частка жанчын была занятая на працы без вялікіх перспектыу росту па службе. Высокі узровень фемінізацыі прафесіі часта з'яуляуся выразным індыкатарам яе нізкага сацыяльнага прэстыжу. Сегрэгацыя жанчын у грамадскай вытворчасці праяўлялася шляхам стварэння унутры "мужчынскіх прафесіи" менш прэстыжных "жаночых спецыяльнасцей" на базе стэрэатыпау грамадскай свядомасці аб "жаночым" занятку, як правіла, малааплачваемым. Адным з вынікау дыскрымінацыі у грамадскай вытворчасці стау разрыу у аплаце паміж жаночай і мужчынскай працай. Штогод павялічвалася колькасць жанчын, занятых разумовай працай. Аднак найбольш высокая прапорцыя жанчын у гэтай сферы назіралася у прафесіях, якія патрабуюць перш за усё пэуных выканаучых навыкау, а не пастаяннага творчага росту: сакратароу, справаводау, машыністак, касірау, рахункаводау. Па даных перапісу 1989 года у гэтых прафесіях у Беларусі працавала кожная трынаццатая жанчына, занятая пераважна разумовай працай. Больш прэстыжнымі у гэтай сферы былі прафесіі бібліятэкара, культасветработніка, школьнага настауніка, урача, эканаміста, бухгалтара, якія таксама лічыліся "жаночымі" з прычыны нізкай аплаты.

Стварэнне умоу працы жанчын Беларусі набывала асаблівую актуальнасць у сувязі з тым, што к 1985 году ужо 94 працэнты іх працавалі поуны рабочы дзень. Практычна усе краіны свету ратыфікавалі Канвенцыю № 4 Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), якая забараняла прыцягваць жанчын, незалежна ад узросту, да працы у начны час на дзяржауных і прыватных прамысловых прадпрыемствах. Аднак, нягледзячы на удзел Беларусі у МАП з 1954 года, яе урад, як і урад СССР, адмовіуся ратыфікаваць і гэтую, і другую, не менш важную канвенцыю МАП 1981 года "Бяспека працы, гігіена і вытворчае асяроддзе", спасылаушыся на тое, што у савецкай краіне аховай працы займаліся прафсаюзы, а не дзяржава. І хоць перыядычна прымаліся пастановы Савета Міністрау і ВЦСПС, якімі прадугледжвалася недапушчэнне жанчын на шкодную вытворчасць, павышэнне механізацыі іх працы, зацвярджаліся снісы прафесій і работ, на

якіх забаранялася выкарыстоуваць іх працу, кіраунікамі міністэрстваў і саміх прадпрыемстваў яны практычна не выконваліся. Напрыклад, на мінскіх трактарным, аутамабільным, маторным заводах, гродзенскім заводзе аутаагрэгатау, брэсцкім заводзе “Сельмаш”, светлагорскім заводзе “Кормімаш” і іншых жанчыны працавалі у танелях ліцейных цэхау, на падвесцы гарачага ліцця. У 1980 годзе у лёгкай прамысловасці сярод ткачоу жанчыны складалі 99 працэнтау, швейнікау — 95 працэнтау, дываншчыц — 96 працэнтау.

У народнай гаспадарцы канчаткова замацавалася месца жанчыны на самых цяжкіх і малакваліфікаваных ручных работах. Яна укладвала асфальт, рамантавала чыгуначныя пуці, працавала на будоулях, выконвала пагрузачна-разгрузачныя работы. Да кола жаночых работ, адначасна малааплатных і самых непрэстыжных, адносіліся уборка тэрыторый і памяшканняу. Каля 90 працэнтау дворнікау, прыбіральшчыкау у краіне былі жанчыны, звычайна немаладога узросту.

Нягледзячы на афіцыйную забарону жанчынам пераносіць на працягу рабочай змены сумарнай масы грузау болей за 7 тон, на прадпрыемствах міністэрства мясцовай прамысловасці, дзе жанчыны складалі 69,3 працэнта ад агульнай колькасці рабочых, на цагельнях за рабочую змену жанчыны уручную перамяшчалі да 30 тон цэглы. І гэтае міністэрства не было выключэннем. На большасці прадпрыемствау рэспублікі нават на перыяд цяжарнасці жанчыны не пераводзіліся на больш лёгкія участкі. Як вынік, урачы рэспублікі адзначалі пастаяннае нарастанне паталогіі у цяжарных жанчын, заучасных родау, пасляродавых інфекцыйна-запаленчых захворванняу у парадзіх і немаулят.

З аднаго боку, жанчыны аб'яуляліся “слабым полам”, з другога боку на іх ускладалася нашмат болей абавязкау, чым на мужчын. У ідэале ад жанчыны патрабавалася быць адказнай работніцай, несці усе хатнія абавязкі, адказваць за выхаванне сваіх дзяцей і заставацца пры гэтым абаяльнай. Патрыярхатныя адносіны былі уласцівыя абсалютнай большасці беларускіх сем'яу, дзе мужчыны былі практычна вызвалены ад хатніх абавязкау. Так, па выніках абследавання 1985 года бюджэту часу сем'яу рабочых, служачых і калгаснікау жанчыны у рабочыя дні затрачвалі у тры разы болей часу, чым мужчыны: адпаведна 208 і 67 мінут у сем'ях рабочых і 235 і 83 мінуты у сем'ях калгаснікау. Больш за 40 працэнтау ад гэтага часу у жанчын займалі абавязкі па забеспячэнні сем'яу прадуктамі харчавання і іх прыгатаванні, што было звязана з цяжкасцямі іх куплі з-за пастаянных дэфіцытау, чэргамі у магазінах, недахопам у гандлі пауфабрыкатау і слабай забяспечанасці сем'яу бытавой тэхнікай. Адпаведна вольнага часу у жанчын было у два разы менш, чым у мужчын: у мужчын у рабочых сем'ях гэта 175 мінут, у сем'ях калгаснікау 152 мінуты у рабочы дзень, у жанчын адпаведна 90 і 60 мінут. Улічваючы цяжар патрыярхатнай маралі, жанчыны жылі пад двайным цяжарам нагрузак.

Удзел жанчын у палітычным жыцці вызначаўся іх лаяльнасцю да існуючай сістэмы. Пры выбарах у Вярхоўны Савет рэспублікі за імі традыцыйна рэзервавалася 30 працэнтаў месцаў. На практыцы пры аднамандатнай сістэме выбараў іх колькасць у Вярхоўным і мясцовых саветах была яшчэ большая: па выніках выбараў 1985 года ў Вярхоўным Савеце Беларусі жанчыны складалі 37 працэнтаў, у мясцовых — нават 50 працэнтаў. Вядома, аднак, што Вярхоўны Савет, якому адводзілася роля фіксаваць ужо гатовыя рашэнні, быў парадным фасадам сацыялістычнай сістэмы. Як толькі сістэма рэзервавання месцаў пасля распаду Савецкага Саюза была ліквідавана, прадстаўніцтва жанчын у выніку першых дэмакратычных выбараў у парламенце ўпала да 3 працэнтаў. Якія каментарыі гэтым фактам ні даваць, і ў гады існавання СССР, і пасля яго распаду жанчыны як сацыяльная група былі фактычна ізаляваныя і ад палітыкі, і ад працэсу прыняцця рашэнняў.

Сацыялістычны эксперымент па эмансіпацыі жанчын пакінуў у многіх з іх пачуццё незадаволенасці і расчаравання. Эмансіпацыя як вызваленне жанчын з-пад улады мужчын, якая адводзіла ім падначаленае месца ў сацыяльнай і сямейнай іерархіі, фактычна не адбылося. Фактам рэальнасці стала ўстойлівае непрыняцце большасцю беларускіх жанчын самога слова эмансіпацыя, якое асацыіравалася ў іх свядомасці не з вызваленнем, а з эксплуатацыяй таннай жаночай працы ў грамадскай вытворчасці і ў сям'і. Паралельна з гэтым фемінізм як ідэалогія з вялікай цяжкасцю пачаў даваць першыя парасткі, аднак і тыя жанчыны, якія лічаць сябе феміністкамі, адчуваюць недахоп тэарэтычнага фундаменту. У савецкім і постсавецкім грамадстве антыфемінізм вельмі моцны і агрэсіўны. Большасць беларускіх жанчын нават і не падазраюць, што фемікістычная тэорыя можа стаць пажыўнай глебай для фарміравання альтэрнатыўнай культурнай фармацыі, у якой жанчыны з аб'екта палітыкі, што ствараецца іншымі, перастаўшы быць "другім класам", дыскрымінаванай маргінальнй групай, ператварыліся б у рухаючую сілу сацыяльных змяненняў, і, стаўшы мацнейшымі, уліліся б у якасці раўнапраўных партнёраў у працэс прыняцця рашэнняў. Нявырашанае "жаночае пытанне" і практычна поўная адсутнасць на постсавецкай прасторы літаратуры, якая б аналізавала становішча жанчын з пазіцый гендэрных уяўленняў, прымушае звярнуцца да сучасных заходніх вышукаў на гэтую тэму.

Тэрмін *гендэр* (gender), які ўжо даволі даўно дамінуе ў жаночых даследаваннях (womens studies), сёння стаў "новай *тэмай* аналізу або новай *катэгорыяй* аналізу" і для палітолагаў[1]. У 1970—90-я гады вывучэнне *гендэра* цалкам было прыўнесена ў сферу палітычнай навукі. Дыскусіі наконт дасягнення роўнасці жанчын з мужчынамі ў заканадаўчых органах і забеспячэння больш справядлівага балансу ў нацыянальных парламентах непазбежна ўздымаюць пытанне, чаму жанчынам так важна быць прадстаўленымі на адказных пасадах большай колькасцю. Іншымі

словамі, у чым розніца, калі пазіцыі палітычнай улады запоунены мужчынамі і жанчынамі у роунай прапорцыі. Аргументы распадаюцца на некалькі катэгорый.

Да першай групы доказау адносіцца палажэнне, што выцякае з *прадстаунічай тэорыі* (the representative theory), якая ставіць у аснову прынцып *натуральнай справядлівасці*, або *сімвалічнай роунасці*. Прынцып *сімвалічнай роунасці* дае базіс патрабаванню жанчын мець раунапрауны доступ да пазіцый улады у палітыцы гэтак жа, як на грамадскіх пасадах, ва універсітэтах, у мэнэджменце, бо, кажучы словамі Сузан Карол, "большае іх прадстауніцтва разглядаецца як дэмакратычнае права, адсутнасць актыунага удзелу жанчын бачыцца як індыкатар таго, што дэмакратычная сістэма працуе няспрауна"[2]. Згодна з гэтай логікай, парламент можа функцыянаваць дэмакратычна толькі у тым выпадку, калі ён дзейнічае як грамадскі форум для выказвання усіх пунктау гледжання, адлюстроуваючы асноуныя падзелы у грамадстве. Таму парламенцкая дэмакратыя патрабуе павелічэння прысутнасці жанчын як самамэты, безадносна, ці нясе гэта нейкія змены.

Па-другое, прадстаунічая дэмакратыя патрабуе большага удзелу жанчын таму, што тады значна маглі б змяніцца і палітычная культура, і палітычныя прыярытэты. Існуе пераканание, што жанчыны менш ваяунічыя, больш альтруістычныя і гуманныя за мужчын. Палітычныя прыярытэты жанчын адрозніваюцца ад прыярытэтау мужчын з прычыны адрознення усяго іх жыццёвага вопыту. Выбранне большай іх колькасці на адказныя пасады прывяло б да змен у грамадскай палітыцы. Даследчыкі сцвярджаюць, што яны схільныя удзяляць больш увагі такім пытанням, як ахова навакольнага асяроддзя, ядзернае раззбраенне, здароуе, клопаты пра дзяцей. Чым болей жанчын дасягае палітычных вяршыняу, тым вальней яны адчуваюць сябе, уздымаючы жаночыя пытанні; большая іх колькасць на кіруючых пасадах аблягчае артыкуляцыю каштоунасцей, стымулюе адкрытае абмеркаванне важных, з пункту гледжання жанчын, праблем. У сувязі з гэтым жаночыя перспектывы заваёуваюць павагу, і праблемы, што маюць спецыяльны інтарэс для жанчын, абмяркоуваюцца болей рэгулярна і па іх часцей прымаюца законы. Член Палаты абшчын ад кансерватыунай партыі, гарачая прыхільніца ідэі большага прадстауніцтва жанчын у парламенце, Тэрэза Горман так характарызуе розніцу у паводзінах заканадаущау: "Калі у нас у парламенце ідуць дэбаты пра міжнародныя справы, ваенныя праблемы, абарону, тут асабліва актыуныя мужчыны. Мужчын няма у час дэбатау па пытаннях сацыяльнай сферы, нягледзячы на тое, што яна займае тры чвэрці усяго нацыянальнага бюджэту, тут мужчыны маюць тэндэнцыю адсутнічаць... Жанчыны ж у час гэтых абмеркаванняу значна больш актыуныя. Я думаю, гэта таму, што жанчыны маюць іншыя прыярытэты"[3].

Па-трэцяе, прысутнасць асобных жанчын на адказных і важных пасадах у пераважна мужчынскіх па складзе кангрэсе, пар-

ламенце ці гарадскім савеце, гэта значыць толькі *сімвалічнае прадстаунціцтва*, звычайна слаба уплывае на палітычныя прыярытэты і не гарантуе, што палітычныя змены адбудуцца. Як адзначае вядомая англиіская палітолаг Джыл Быстыдэнскі, “пры такіх умовах жанчыны дабіваюцца грамадскіх пасад або таму, што яны дзейнічаюць як мужчыны-палітыкі, або яны знаходзяць мала падтрымкі сярод сваіх калегау мужчын, калі яны стараюцца выказаць жаночыя інтарэсы. Аднак, як толькі жанчыны у такіх інстытутах дабіваюцца істотнай прапорцыі, яны пачынаюць рабіць уплыу на палітычны працэс”[4]. Абапіраючыся на вопыт Нарвегіі, Быстыдэнскі падводзіць да вываду, што жаночае прадстауніцтва пачынае рабіць уплыу, калі яно дасягае, прынамсі, 15 працэнтау[5]. Аднак побач з дасягненнем істотнага прадстауніцтва, жанчыны павінны самі добра усведамляць свае інтарэсы і гаварыць пра свае праблемы. Такім чынам, павелічэнне колькасці жанын у паблік офіс само па сабе можа не быць дастатковым.

Па-чацвёртае, існуе думка, што уваходжанне большай колькасці жанчын у палітычныя структуры паслужыла б аздарауленчым струменем у выпрауленні дрэннай славы, якую набылі і палітыкі, і палітычнае жыццё за апошнія гады. Выключэнне жанчын з працэсу прыняцця рашэнняу захавала іх імідж несапсутым удзелам у палітычнай карупцыі. Гэта вызначае яшчэ адну прычыну, чаму пытанне вылучэння як мага большай колькасці жанчын на вышэйшыя пазіцыі у партыйных структурах і у дзяржаве такое важнае. Паколькі відавочна, што жанчыны здольныя займаць такія пасады, іх дыскрымінацыя і, як вынік яе, невыкарыстанне на адказных пасадах становіцца істотнай стратай каштоунага рэсурсу.

У традыцыйнай паліталогіі існуе тэндэнцыя вызначаць *палітыку* як мэтанакіраваную дзейнасць, абмежаваную рамкамі грамадскай сферы, у якой і адбываецца прыняцце рашэнняу. Згодна гэтай фармулёукі *палітыка* — гэта нешта такое, што цалкам належыць “грамадскай сферы” і не пашыраецца на “прыватную сферу”. Феміністкі радыкальнага напрамку рэзка раскрытыкавалі вузкія агульнапрынятыя трактоукі разумення *палітыкі*. Для радыкальных феміністак адрозненне паміж *грамадскім* і *персанальным* жыццём існуе толькі з-за асіметрычных “адносін улады і падпарадкавання”, што усталяваліся паміж поламі. Яны настойваюць, што “персанальнае з’яуляецца палітычным”[6] і адмауляюць існаванне як у тэорыі, так і на практыцы адрозненняу паміж сферай *прыватнага* і сферай *грамадскага*. Большасць феміністак пагаджаецца, што адрозненні паміж *грамадскім* і *прыватным* жыццём створаны штучна і з’яуляюцца надуманай умоунасцю, якая існуе, каб схаваць уладную узаемазалежнасць паміж мужчынамі і жанчынамі. Радыкальныя феміністкі разглядаюць канфлікт паміж мужчынамі і жанчынамі як фундаментальны канфлікт у грамадстве, у адносінах да якога усе астатнія адрозненні і канфлікты такія, як сацыяльныя, класавыя або расавыя, з”яуляюцца усяго толькі другаснымі.

Нягледзячы на існаванне разнастайных падыходаў у трактоўцы улады ў рамках феміністычнай навукі, феміністкі лічаць, што гаварыць пра ўладу, значыць, абмяркоўваць *гендэр*, іншымі словамі, узаемаадносіны ўлады і падначалення — гэта адносіны паміж *гендэрамі*. Феміністычная тэорыя настойвае не толькі на тым, што ўладныя адносіны ўяўляюць сабой адносіны паміж *гендэрамі*, але таксама на тым, што жанчыны і вызначаюць уладу, і карыстаюцца ёю інакш, чым мужчыны. Мужчыны, сцвярджаюць феміністкі, бачаць уладу, як *уладу над*, як магчымасць уплываць або дамінаваць, у той час, як жанчыны бачаць уладу як *паўнамоцтва да*. *Упаўнамочванне* ў сэнсе, у якім гэтае слова выкарыстоўваюць феміністкі, азначае працэс, з дапамогай якога прыгнечаныя асобы адваёўваюць кантроль над сваімі жыццямі, пашыраючы свой удзел у справах і структурах, якія даюць ім непасрэдны эфект. У працэсе гэтага людзі робяцца здольнымі кіраваць сабой эфектыўна. Гэты працэс прадугледжвае выкарыстанне ўлады, але не як *улады над* іншымі, што традыцыйна бывае; хутчэй, улада бачыцца як *упаўнамочванне* або як кампетэнцыя.

Такім чынам, улада бачыцца ў руках жанчын больш кааператыўнай і менш канфрантацыйнай, чым у руках мужчын. Гэты пункт гледжання знаходзіць падтрымку таксама сярод жанчын-палітыкаў. Напрыклад, Тэса Джоэл, член Палаты абшчын ад лейбарысцкай партыі і ценевы міністр па справах жанчын у 1995—1996 гадах, так характарызуе жаночы стыль у палітыцы: “Жанчыны больш адчувальныя, больш схільныя да супрацоўніцтва, менш канфрантацыйныя. Яны шукаюць больш практычныя рашэнні, чым мужчыны. Я думаю, жаночы, больш талерантны падыход унясе змены ў палітычную культуру”[7].

Гэтая вера ў іншы падыход у палітыцы, уласцівы жанчынам, напэўна, з'яўляецца адным з найбольш частых аргументаў у адстойванні патрабавання павелічэння колькасці жанчын на элітных пазіцыях. Феміністычнымі аўтарамі былі таксама прапанаваны дзве ўзаемасупярэчлівыя канцэпцыі для аналізу ўзаемаадносін жанчын са светам палітыкі. Першая атрымала назву *канцэпцыі маргінальнасці*. *Маргінальнасць* вызначаецца як стан, уласцівы чалавеку, які жыве ў якасці ўдзельніка “двух розных светаў”, “дзвюх культурных сістэм” адначасова, адна з якіх у адпаведнасці з пераважнымі стандартамі разглядаецца як “вышэйшая ў адносінах да другой”. Многія аўтары бачаць жанчын у якасці такой маргінальнай групы, яны спрабуюць адпавядаць абодвум стандартам, і такім чынам выконваюць двайную работу, нясуць двайную ношу. Адносна ж жанчын-палітыкаў вядомая даследчыца Вірджынія Сапіра сцвярджае, што пра іх мяркуюць, зыходзячы з двух стандартаў: “першы, стандарт-фемініннасці, і другі, стандарт палітыкі — не феміні́нны і вышэйшы ў адносінах да першага. Мяркуецца, што дзеянні жанчын у палітыцы вынікаюць з іх клопатаў жонкі, маці і хатняй гаспадыні, хоць у грамадскім свеце палітыкі гэтыя клопаты бачацца як спецыфічныя, якія не ўпісваюцца ў гэты свет... Такім чынам... жанчыны

у палітыцы маюць два выбары. Яны могуць разглядаць сябе і дзейнічаць у палітычным свеце адпаведна з пераважаючым стандартам палітыкі і быць нефемініннымі, ці яны могуць разглядаць сябе і дзейнічаць у палітыцы у адпаведнасці са стандартамі фемініннасці і выглядаць дзікавата[8].

Другая канцэпцыя атрымала назву *інтэграцыі*. Вірджынія Сапіра сцвярджае, што палітычная інтэграцыя жанчын складаецца з двух элементау — з ролі, якую жанчыны адыгрываюць у свеце палітыкі, а таксама ролі, якую яна адыгрывае у іх жыцці. Да таго часу, пакуль урады уцягнуты у рэгуляванне нараджальнасці, сексуальнасці, падзелу працы і уласнасці у сям'і, а таксама умоу, якія ствараюць або разбураюць сям'ю, без улады у палітычным свеце жанчыны не змогуць на справе валодаць поунай мерай улады у прыватным жыцці.

"Калі б свет фемініннасці і свет палітыкі былі інтэграванымі, не было б нічога дзіунага у тым, што жанчыны удзельнічаюць у палітыцы ці уцягваюцца у тое, што зараз мае ярлык жаночыя пытанні. (Што было б "жаночым пытаннем", калі б прыватны свет сям'і і грамадскі свет палітыкі існавалі нераздзельнымі адзін ад аднаго, ці калі б мужчыны і жанчыны падзялілі у роунай ступені сямейныя і палітычныя клопаты?) Жанчыны цяпер маюць палітычныя правы і удзельнічаюць у палітыцы, але яны усё яшчэ не поунасцю інтэграваныя у палітычны свет"[9].

Літаратура апошняга дзесяцігоддзя змяшчае шмат інфармацыі аб тым, як увесці болей жанчын у палітыку. Выяуленне сувязі паміж *гендэрам* і *палітыкай* з'яуляецца прадуктам трох роднасных вымярэнняу у даследаванні сучасных палітычных партый. Па-першае, прызнанне, што веды аб узаемадзеянні *гендэра* і партыйнай палітыкі з'яуляюцца вельмі важнымі для разумення палітычнага статуса жанчыны. Па-другое, даследаванне поспеху жанчын у палітычных партыях з'яуляецца важнай ілюстрацыяй аспектау партыйнай палітыкі. Па-трэцяе, *гендэр* стау зараз тэмай яунага інтарэсу многіх палітычных партый на Захадзе, і тое, як яны трактуюць і улічваюць яго, дыктуе спосаб і накірунак іх палітычных дзеянняу.

Тэарэтычная дыскусія працягваецца, і феміністычныя аутары, якія рэзка аспрэчваюць традыцыйныя вывады аб прыродзе жаночых інтарэсау і палітычныя стратэгіі, што адсюль выцякаюць, стымулююць далейшае абмеркаванне гендэрнага кампанента у палітыцы. Зыходзячы з гэтага, паспрабуем і мы сфармуляваць некаторыя пытанні, адказы на якія дапамогуць нам зрабіць першыя спробы сур'ёзнага аналізу становішча жанчын у савецкай і постсавецкай прасторы.

У чым жа заключаецца спецыфічнае жаночае пытанне? Ці трансфармуецца яно разам з грамадскімі зmяненнямі, ці застаецца нязменным? Тады — якім? Ці заключаюцца асноуныя спадзяванні жанчын толькі у паляпшэнні сістэмы сацыяльна-бытавога абслугоування, як пра гэта заусёды пісалася, ці мы павінны адкрыта заявіць аб тым, што больш не могуць і не хочуць жанчыны

быць другім класам, дыскрымінаванай маргінальнай групай, але хочуць і могуць удзельнічаць у працэсе прыняцця рашэнняў.

Мы павінны задумацца над новым зместам, які мы збіраемся укласці ў слова эмансіпацыя. Бо эмансінацыя — гэта вызваленне жанчын з-пад улады мужчын (бацькоў і мужоў) — улады, якая адводзіла ім падначаленае месца ў сацыяльнай і сямейнай іерархіі. Эмансінацыя ў савецкай мадэлі — гэта жорсткая эксплуатацыя працы жанчын на фоне іх поўнага выключэння з працэсу прыняцця рашэнняў.

Нарэшце, нам трэба прааналізаваць, як працуюць механізмы дыскрымінацыі жанчын. Сёння адкрытая дыскрымінацыя не такая небяспечная, таму што дыскрымінаваць адкрыта становіцца ўсё цяжэй, але значна больш небяспечная скрытая дыскрымінацыя, якая, прыстасоўваючыся да новых умоў, відазмяняецца, набывае цывілізаваныя формы.

[1] Сучасная феміністычная тэорыя адрознівае пол і гендэр. Пол дадзены нам ад нараджэння. Гендэр — сацыяльная арганізацыя палавых адрозненняў. Пол не выбіраюць. Гендэр — культуралагічная характарыстыка паводзін, якая адпавядае полу ў дадзеным грамадстве ў дадзены час. Гендэр — гэта набор сацыяльных роляў. Гэта — касцюм, маска, уціхамірвальная кашуля, у якой мужчыны і жанчыны выконваюць свае няроўныя танцы. Стэрэатыпы наконт гендэра адлюстроўваюць погляды грамадства на паводзіны, якія падыходзяць мужчынам ці падыходзяць жанчынам. Вірджынія Сапіра дала азначэнне gender у святле характарыстык палітолагаў як “социякультурную маніфестацыю факта знаходжання мужчынам ці жанчынай ...засвоеныя характарыстыкі, чаканні і мадэлі паводзін. Gender — гэта усвядомленае значэнне пола”.

[2] Garroll S. “Women Candidates and Support for Feminist Concerns”. Fhe Western Political Quarterly. Vol. 37. No.2, June 1984. P.307.

[3] Інтэрв’ю аўтара з членам парламента ад кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі Тэрэзай Горман. 24 ліпеня 1996.

[4] Bystydzienski, J. Women Transforming Politics. Bloomington, 1992. C.15.

[5] Тамсама.

[6] The personal is political — фраза, якая належыць Carol Hanisch. Упершыню яна з’явілася ў яе працы 1970 г. “Notes from the Second Year” і стала галоўным лозунгам другой хвалі фемінізму.

[7] Інтэрв’ю аўтара з ценевым міністрам у лейбарысцкім урадзе, членам парламента Вялікабрытаніі Тэсай Джоэл, 24 ліпеня 1996.

[8] Sapiro V. The Political Integration of Women. Urbana. 1984. C.7.

[9] Тамсама.

**Валянціна Трыгубовіч**
*Часопіс “Мастацтва”*

## ГАЛОЎНАЕ — БЫЦЬ АСОБАЙ

“Захапленне жывапісам за апошнія дзвесце гадоў значна разраслося сярод жанчын, так што жанчыне і тут адкрыта шырокая дарога. Але жывапіс і гравіраванне ўяўляюць для жанчын толькі род вытанчанага рукадзелля, чым і тлумачацца тыя абставіны, што дагэтуль жанчыны дамагліся параўнаўча няшмат у сусветнай гісторыі мастацтва, ды й то пераважна ў галіне маляў-